

Пры заключэнні кантракта з работнікам, незалежна ад ужывальных умоў аплаты працы (на аснове або без Адзінай тарыфнай стаўкі), наймальнік абавязаны яму ўстанавіць дадатковыя меры стымулявання.

СТАР. 2



Дэпрэсія часта спалучаецца з ішэмічнай хваробай сэрца. З аднаго боку, яна спрыяе развіццю ішэміі і яе ўскладненняў, з другога — можа развіцца як рэакцыя пацыентаў на сардэчнае захворванне.

СТАР. 3



Імя яго — імператарскае. Прозвішча — ну надта народнае. А тым больш што за доўгае і плённае жыццё артыст Аўгуст Мілаванаў сапраўды заслужыў званне народнага артыста Беларусі.

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ЧЭРВЕНЯ 2012 г. СУБОТА № 115 (27230) Кошт 1200 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я  Г А З Е Т А

*Працаўнікам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь*

**Дарагія сябры!**

Ад усёй душы віншую вас з Днём медыцынскіх работнікаў.

Разам з вамі ўся краіна адзначае ваша прафесійнае свята. Гэта знак глыбокай павагі і ўдзячнасці ўрачам, навукоўцам-медыкам, малодшаму і сярэдняму медыцынскаму персаналу, правізарам і фармацэўтам.

Айчынная ахова здароўя інтэнсіўна развіваецца. У распараджэнні беларускіх урачоў маюцца самыя сучасныя тэхналогіі, эфектыўныя метады дыягностыкі і найноўшае абсталяванне. Усё гэта дазваляе перамагаць хваробы, якія яшчэ зусім нядаўна лічыліся невылечнымі.

Але вырашальная роля ў медыцыне заўсёды будзе належаць людзям, адданым свайму прызванню. Дзякуючы вашым ведам, досведу і таленту пацыенты набываюць здароўе і вяртаюцца да паўнацэннага жыцця.

Прыміце словы шчырай падзякі за самаахвярнае служэнне абавязку, высокі прафесіяналізм і добрыя сэрцы.

Зычу вам новых працоўных поспехаў, шчасця і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 15 чэрвеня разгледзеў кадравыя пытанні.**

**Кіраўнік дзяржавы назначыў:**

МІХНЕВІЧА Валянціна Уладзіміравіча — першым намеснікам міністра ўнутраных спраў — начальнікам крымінальнай міліцыі;

ДАРОШКУ Сяргея Іванавіча — начальнікам Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў;

ЯЎСЕЕВА Ігара Уладзіміравіча — начальнікам упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама.

**Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:**

ГАЕЎСКАГА Ігара Уладзіміравіча — намеснікам міністра аховы здароўя — галоўным дзяржаўным санітарным урачом Рэспублікі Беларусь;

БУДКЕВІЧА Васіля Антонавіча — намеснікам міністра адукацыі;

РУДАГА Сяргея Валянцінавіча — намеснікам міністра адукацыі;

ТРУБІЛЫ Генадзя Аляксеевіча — намеснікам міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

КАВАЛЬКОВА Валерыя Валер'евіча — намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны;

КАРАНКЕВІЧА Віктара Міхайлавіча — намеснікам міністра энергетыкі;

СЯМАШКІ Сяргея Аляксандравіча — намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі — дырэктарам Дэпартамента па энергаэфектыўнасці;

АНУФРЭЕНКІ Генадзя Віктаравіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Магілёўскі завод «Строммашына»;

ГАЎРЫЛКОВІЧА Эдуарда Генадзьевіча — генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства «Граніт»;

КАСЯЧЭНКІ Рыгора Паўлавіча — рэктарам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры»;

КІСЯЛЁВА Уладзіміра Аляксеевіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Беларускі цэментны завод»;

ГРОЕРАВА Юрыя Георгіевіча — першым намеснікам старшыні дзяржаўнай установы «Тэлерадыёвяшчальная арганізацыя Саюзнай дзяржавы».

Назначаючы кіруючы склад сістэмы МУС, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «гэта не проста нейкія радавыя назначэнні, маючы на ўвазе цяперашнюю сітуацыю». «Я не проста так сказаў аб тым, што нам трэба рэфармаваць МУС, але рэфармаваць не ламаючы, як гэта звычайна бывала, можа быць, і ў нас, і ў нашых суседзяў, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы не збіраемся перайменаваць МУС неяк інакш (у паліцыю, напрыклад). Гэта проста непрымальна для нашага грамадства. Мы не збіраемся праводзіць нейкую структурную ломку, таму што асноўная структура міністэрства і органаў унутраных спраў, я лічу, нармальная».

«Рэформа павінна заключацца ва ўдасканаленні той структуры, якая сёння створана. Гэта прынцыповае і канцэптуальнае палажэнне развіцця нашай дзяржавы. Рэформу мы заўсёды павінны разумець як удасканаленне, — заявіў Прэзідэнт. — Мы павінны ў ходзе гэтай рэформы, па-першае, вызваліць МУС ад неўласцівых функцый. Па-другое, трэба і з колькасцю паглядзець. Я маю на ўвазе, што, скараціўшы колькасць, мы абавязкова павінны гэтыя сродкі пакінуць у распараджэнні міністра для таго, каб менш было размоў, што грошай не хапае, што грашовае забеспячэнне не тое. Няхай гэта павялічыць грашовае забеспячэнне для органаў унутраных спраў». Пракантраляваць пытанне расходавання грашовых сродкаў кіраўнік дзяржавы даручыў дзяржсакратару Савета бяспекі Леаніду Мальцаву.

«Калі б я планаваў нейкую карэнную ломку і не верыў МУС, я не даручаў бы міністру і яго падначаленым сёння ўнесці прапановы па рэфармаванні. Але карэннай ломкі МУС не будзе. Таму я чакаю ад вас прапаноў. Але гэта не значыць, што дзяржсакратар, які сёння курыруе гэты напрамак, не ўнясе нейкія дапаўненні да таго, што вы прадставіце», — сказаў Прэзідэнт, адзначыўшы, што гэтыя прапановы стануць «лакмусавай паперкай на здольнасць кіраваць і мадэрнізаваць сваю структуру». «Пачынаць трэба знізу, з участковага. І ўсюды трэба дакладна прапісаць галоўныя напрамкі рэфармавання», — падкрэсліў Прэзідэнт.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**



## У ВАНДРОЎНІКАЎ ЗАЎСЁДЫ ДОБРАЕ НАДВОР'Е

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Старшакласнікі Доўскай гімназіі выпраўляюцца ў 25-кіламетровы паход па Рагачоўскім раёне, каб пашырыць веды па краязнаўстве і праверыць сябе на фізічную трываласць. Апошнім пунктам гэтага вандроўнага маршруту стане маляўнічы бераг Дняпра каля вёскі Свержань.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Сямён ШАПІРА, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

***Інвестыцыйная прывабнасць Астраўца ўжо не меншая, чым абласнога цэнтра. На аўкцыёнах зямельныя ўчасткі ў Астраўцы і Астравецкім раёне «ідуць» літаральна за 5 хвілін. Так, 1 га зямлі пад будаўніцтва гандлёвага цэнтра ў будучым горадзе энергетыкаў рэалізаваны амаль за Br1 млрд — столькі ж каштуе аналагічны ўчастак пад гіпермаркет у Гродне.***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 23° |
| Віцебск | + 22° |
| Гомель | + 20° |
| Гродна | + 23° |
| Магілёў | + 21° |
| Мінск | + 20° |

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 16.06.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8290,00 | ▼ |
| Еўра | 10470,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 256,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1027,45 | ▲ |

■ 17 чэрвеня — Дзень медыцынскага работніка

Дзмітрый ШАЎЦОЎ:

## «АБАРАНІЦЬ І ПАДСТРАХАВАЦЬ УРАЧА. НА КАРЫСЦЬ ПАЦЫЕНТА»



**Урач — самая гуманная, высакародная і самая складаная ў эмацыйным і маральным плане прафесія. Кожны пацыент памятае свайго доктара — таго, хто яго вылечыў і выратаваў яму жыццё. Разам з тым у працы нават самага высокакваліфікаванага спецыяліста існуе рызыка прафесійнай памылкі. Менавіта таму ў сусветнай практыцы прафесійная адказнасць урачоў, як правіла, падлягае абавязковаму страхаванню. Напярэдадні Дня медыцынскага работніка мы сустрэліся са старшынёй Беларускай асацыяцыі ўрачоў, галоўным урачом 34-й сталічнай паліклінікі Дзмітрыем ШАЎЦОВЫМ, каб пагаварыць пра тое, што хвалюе сёння беларускіх медыкаў:**

— Вы маеце рацыю, сапраўды страхаванне ва ўсім свеце з'яўляецца асновай ажыццяўлення любой дзейнасці, а тым больш урачэбнай. У нас прафесійная адказнасць урача таксама страхуецца, але не ў абавязковым, а ў добраахвотным парадку, таму такое страхаванне пакуль не атрымала шырокага распаўсюджвання. Асабіста я ўпэўнены, што страхаванне ўрачэбнай рызыкі абараняе не толькі пацыента, але і стымулюе ўрача. Патлумачу, што я маю на ўвазе. Сёння ўрач у нашай краіне абсалютна не абаронены: яго можна прыцягнуць да адказнасці як па адміністрацыйным, так і па крымінальным заканадаўстве. Вас цікавіць, што дае ўрачу страхаванне?

У тым выпадку, калі паміж урачом і пацыентам узнікае канфліктная сітуацыя, тут жа падключаецца страхавая кампанія. Урач не ўцягваецца ў канфлікт і працягвае спакойна працаваць. А прадстаўнік страхавой кампаніі яшчэ на дасудовым этапе спрабуе з пацыентам дамовіцца, выплаціўшы яму грашовую кампенсацыю. У тым выпадку, калі пацыент настойвае на перадачы справы ў суд, страхавая кампанія выстаўляе свайго эксперта, які выступае ў судзе абаронцам урача, і ліквідацыя канфлікту ўсё роўна адбываецца ў вузкім коле, імідж урача і ўстановы аховы здароўя ад гэтага не церпіць. Аднак калі ўрач адзін раз дапусціў памылку, другі, трэці, то страхавая кампанія можа паставіць пад сумненне яго кваліфікацыю і сказаць: «Паважаны спецыяліст, калі ласка, стаўцеся больш уважліва да сваёй работы»... Натуральна, што калі пацыенты будуць пастаянна скардзіцца на медыцынскага работніка, то страхавая кампанія скасуе з ім дагавор. Таму наяўнасць страхавога пасведчання для ўрача з'яўляецца свайго роду пацвярджэннем, што ён валодае высокім прафесіяналізмам, і менавіта таму страхавая кампанія гатова яго абараняць. Гэта павышае статус урача.

СТАР. 3

■ Надвор'е

## У ВЫХАДНЫЯ ЦЁПЛА І БЕЗ АПАДКАЎ

**паведаміла БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук.**

У папярэднія дажджлівыя дні месячная норма ападкаў у Беларусі была выканана, а ў некаторых метэастанцыях перавыканана. Асабліва дажджлівы быў дзень 13 чэрвеня, калі пад уплывам цыклону па краіне прайшлі дажджы, у многіх раёнах — моцныя.

Сёння паўднёвы цыклон, адыходзячы на поўнач еўрапейскіх раёнаў Расіі, будзе фарміраваць надвор'е толькі на ўсходзе Беларусі. Днём па Віцебскай і Магілёўскай абласцях пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы, у астатніх раёнах чакаецца пераважна без ападкаў. У нядзелю, 17 чэрвеня, вобласць павышанага атмасфернага ціску будзе асноўным фактарам фарміравання надвор'я. У многіх раёнах краіны будзе пераважна без ападкаў, толькі днём па паўночным захадзе і захадзе ў асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра пачне павышацца: у дзённы час яна будзе вагацца ад 23 градусаў на поўначы да 30 на поўдні краіны. У пачатку наступнага тыдня Беларусь будзе знаходзіцца пад уплывам цёплага антыцыклону. Пачынаючы з панядзелка, будзе пераважаць тэмпература ноччу плюс 11-18 градусаў, днём — плюс 23-28, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях паветра прагрэецца да 32 градусаў.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ВЕНЕСУЭЛА МОЖА ЛІЧЫЦЦА ЎЛАДАЛЬНІКАМ НАЙБУЙНЕЙШЫХ ЗАПАСАЎ НАФТЫ Ў СВЕЦЕ



Венесуэла стала ўладальнікам найбуйнейшых даказаных запасаў нафты сярод краін свету, абагнаўшы Саудаўскую Аравію, паведамляе BP Plc. Як адзначаецца ў штогадовым статыстычным аглядзе сусветнай энергетыкі BP, даказаныя запасы нафты ў Венесуэле на канец 2011 года склалі 296,5 млрд барэляў, або 17,9% агульнасусветных запасаў. Саудаўская Аравія на 31 снежня, па звестках BP, мела 265,4 млрд барэляў нафты, што больш, чым рэсурсы ўсіх 34 самых развітых краін свету — членаў Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця. Запасы нафты ў Расіі ў аглядзе BP ацэненыя ў 88,2 млрд барэляў, або 5,3% агульнасусветнага аб'ёму. Пры гэтым Расія, па звестках кампаніі, застаецца найбуйнейшым сусветным вытворцам нафты.

### ЗША ПААБЯЦАЛІ ГРУЗІІ ДАПАМОГУ Ў РАСПРАЦОЎЦЫ СПА

ЗША дапамогуць Грузіі ў распрацоўцы яе ўласных сродкаў сачэння і супрацьпаветранай абароны, а таксама ў мадэрнізацыі парку верталётаў. Пра гэта гаворыцца ў заяве Дзяржддэпартамента ЗША. Заява была зроблена ў сувязі з нядаўнім візітам у Грузію дзяржсакратара ЗША Хілары Клінтан і пасяджэннем амерыкана-грузінскай камісіі па стратэгічным партнёрстве з удзелам прэм'ер-міністра Грузіі Нікі Гілаўры. На пасяджэнні абмяркоўваліся варыянты аказання дапамогі грузінскаму боку ў распрацоўцы сродкаў паветранага сачэння, а таксама сродкаў назірання ў прыбярэжнай паласе. ЗША таксама не выключаюць дапамогі Грузіі ў трэніроўцы ваеннага персаналу і ў мадэрнізацыі верталётаў агульнага прызначэння. ЗША зноў падкрэслілі, што лічаць Абхазію і Паўднёвую Асецію тэрыторыямі Грузіі.

### ЖАНЧЫНЫ ФРАНЦУЗСКАГА ПРЭЗІДЭНТА ЎЧЫНІЛІ ЯМУ ПАЛІТЫЧНЫ СКАНДАЛ

Прэзідэнт Францыі Франсуа Аланд апынуўся ў цэнтры палітычнага скандалу з-за канфлікту паміж яго былой грамадзянскай жонкай Сегален Руаяль і яго цяперашняй спадарожніцай Валеры Трырвейлер. На першай паласе Le Monde ад 14 чэрвеня скандал ахарактарызаваны як «першыя праблемы нармальнага прэзідэнцтва». Le Figaro напісаў пра «разгубленасць у вярхах дзяржавы». 12 чэрвеня Трырвейлер напісала ў сваім мікраблогу: «Удачы Аліўе Фаларні, які ніколі не быў недастойным, які столькі гадоў бескарысліва служыў жыхарам Ла-Рашэль і змагаўся разам з імі». Фаларні, як і Руаяль, балатуецца ў французскі парламент ад горада Ла-Рашэль. Руаяль пракаментавала словы Трырвейлер толькі праз суткі, бо, па яе ўласных словах, заява цяперашняй спадарожніцы Аланда была «занадта жорсткай». «Я адчуваю сябе зусім разбітай, я не робат», — прыводзіць словы Руаяль Le Figaro. Як адзначае The Daily Telegraph, Аланд, які спрабуе трымацца ў баку ад парламенцкіх выбараў, афіцыйна выказаў сваю падтрымку Руаяль. Менавіта з-за гэтага, па непацверджаных звестках, Трырвейлер і пажадала ўдачы суперніку былой жонкі прэзідэнта. Прадстаўнікі правых палітычных сіл у адказ на скандал абвінавацілі прэзідэнцкую пару ў змешванні прыватнага і публічнага жыцця.



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### СЕЙМ ЛАТВІІ ПРАГАЛАСАВАЎ ЗА ПАВЫШЭННЕ ПЕНСІЙНАГА ЎЗРОСТУ

Сейм Латвіі прыняў у канчатковым чытанні папраўкі ў заканадаўства, якія прадугледжваюць павелічэнне пенсійнага ўзросту на некалькі гадоў. Аб гэтым паведамляе DELFI.

За адпаведны законапраект прагаласавалі прадстаўнікі кіруючай кааліцыі (партыі «Адзінства», Партыі рэформаў і аб'яднання нацыяналістаў). Усяго дакумент падтрымалі 49 дэпутатаў, 39 парламентарыяў выступілі супраць.

Па цяперашняй сістэме жыхары Латвіі сыходзяць на пенсію ў 62 гады. Папраўкі прадугледжваюць павышэнне пенсійнага ўзросту да 65 гадоў. Павялічвацца гэты паказчык будзе паступова: штогод, пачынаючы з 2014 года, яго будуць павышаць на некалькі месяцаў. Завершыцца гэты працэс у 2025 годзе.

КОРАТКА

Грашовыя даходы ў разліку на душу насельніцтва ў студзені—красавіку склалі Br2 млн 209 тыс. у месяц. Агульны аб'ём грашовых даходаў насельніцтва Беларусі склаў у студзені—красавіку бягучага года Br83,6 трлн, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Экспартна-імпартны банк Кітая прадаставіць у крэдыт $344 млн на рэканструкцыю рэспубліканскай аўтамабільнай дарогі М-5/Е 271 Мінск—Гомель на ўчастку Бабруйск—Жлобін.

Беларускія ўрачы прапануюць укараніць так званы сертыфікат здароўя. Гэта складзены медыцынскім работнікам пералік неабходных прафілактычных абследаванняў і аналізаў. У сертыфікат здароўя можа ўваходзіць, напрыклад, камп'ютарная тамаграфія, ультрагукавое даследаванне, аналізы крыві, скрынінгавыя даследаванні, прызначаныя для ранняга выяўлення раку малочнай залозы або прастаты.

У Беларусі з 1 жніўня 2012 года падаражэюць тарыфы на тэхнічнае абслугоўванне і карыстанне ліфтамі.

## ІДЭАЛЬНАЕ МЕСЦАЖЫХАРСТВА: ГОРАД ЦІ ВЁСКА?



**Валянціна АЛЕКСАНДРОВІЧ, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, мінчанка:**

— Лепш жыць ці ў маленькім горадзе, ці ў вёсцы. Там чысцюткае паветра, больш здаровае харчаванне. У вялікім горадзе, асабліва летам, цяжка дыхаць. Немагчыма нават прагуляцца: паўсюль машыны. Як урачу, мне навідавоку хібы гарадскога жыцця. Калі б была магчымасць, з задавальненнем пакінула б сваю мінскую кватэру і з'ехала б у вёску. На жаль, нават родзічаў у сельскай мясцовасці ў мяне ўжо не засталося. Таму час ад часу дазваляю сабе кароткатэрміновы адпачынак у санаторыі.



**Дзмітрый ШВАКЕЛЬ, памочнік машыніста лакаматыўнага дэпо:**

— Сёння ўся моладзь цягнецца ў горад. І гэта зразумела. Тут шмат магчымасцяў уладкавацца на працу, у горадзе большыя і заробкі. Гарадскі вір з яго інфраструктурай прадастаўляе шэраг варыянтаў, як правесці вольны час. Аднак адпачываць можна па-рознаму. Летам, напрыклад, вёска — найлепшы курорт: чыстае паветра, рэчка, а для аматараў — ягады і грыбы. Я з задавальненнем выкарыстоўваю гэтыя вясковыя магчымасці, калі адпачываю ў бабулі і дзядулі.



**Люба СЫРАМЯТНІКАВА, вучаніца сярэдняй школы № 16 г. Ліды:**

— Як па мне, дык у горадзе цікавей. Тут і каруселі, і Лядовы палац, і кінатэатр, і шматлікія крамы. Яшчэ ў Лідзе — усе мае сябры, без якіх я вельмі сумую, калі з'язджаю разам з бацькамі ў вёску ці на дачу. Праўда, майму сабачку на вясковай траўцы значна лепш.

**Падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАЦВЯРДЖАЕ ЗАДАЧУ ПА ДАСЯГНЕННІ Ў 2012 ГОДЗЕ ПРЫРОСТУ ВУП НА ЎЗРОЎНІ 5,5 ПРАЦЭНТА

**У Беларусі па выніках 2012 года прырост ВУП павінен скласці 5,5 працэнта. Адпаведную задачу кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў 15 чэрвеня, прымаючы з дакладам старшыню праўлення Нацыянальнага банка Надзею Ермакову.**

На сустрэчы абмяркоўваліся рэалізацыя грашова-крэдытнай палітыкі дзяржавы і работа банкаўскай сістэмы ў кантэксце развіцця эканомікі краіны. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што першыя 5 месяцаў гэтага года «прайшлі на фоне невялікіх хваль, якія засталіся ад фінансавага крызісу ў мінулым годзе».

«Цяперашні перыяд характарызуецца тым, што мы поўнасцю валодаем сітуацыяй, кантралюем яе і кіруем ёю, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Таму нам трэба вырашыць асноўныя пытанні, у ліку якіх — дасягненне ў гэтым годзе росту ВУП на 5,5 працэнта. Гэта павінна быць няўхільна выканана тымі механізмамі, якія мы выпрацавалі». «Яшчэ раз падкрэсліваю: ніякіх шалёных грошай быць не павінна. У нас эканоміка працуе нармальна, яна можа сябе забяспечваць, у тым ліку прадпрыемствы могуць забяспечыць узнаўленне асноўных сродкаў. Таму павінна быць выкананне заяўленых паказчыкаў ВУП за кошт эфектыўнасці эканомікі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў: «Ніякіх размоў не павінна быць наконт таго, што вось, маўляў, дзяржаўная ўласнасць не можа даць эфекту, а прыватная — можа. І прыватная, і дзяржаўная павінны даваць эфект». «Размовы аб тым, што мы не дасягнем у гэтым годзе сярэдняй зарплаты ў эквіваленце $500, — пустыя. Аб гэтым сведчыць дзейнасць многіх прадпрыемстваў. Напрыклад, у Мінску сярэдняя зарплата набліжаецца да $500 і будзе большай. Чаму іншыя не могуць? І іншыя павінны». Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Прыватнікі павінны паставіць для сябе задачу дасягнення ў гэтым годзе сярэдняй зарплаты не $500, а пад $700. А на дзяржпрадпрыемствах гэта лічба павінна перасягнуць мяжу $500. Гэта жалезна павінна быць выканана».

«Размовы аб тым, што нечага для гэтага не хапае — беспадстаўныя. Тады паўстае пытанне: чаму сёння амаль усе кіраўнікі, спецыялісты, менеджары прыватных прадпрыемстваў у «Мерседэсах» раз'язджаюць? Што, грошай няма ў фірмы, каб заплаціць людзям нармальную зарплату? Ёсць. Няхай прададуць «Мерседэсы» і плацяць людзям зарплату», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы выказаўся і аб дзяржаўным сектары: «Паглядзіце, якія там расходы. Няхай скарачаюць да мінімуму сабекошт і на нармальны ўзровень узнімаюць заработную плату людзей. Гэта не нейкі там страх перад чымсьці, як некаторыя тут нашы «свядомыя» і жоўтая прэса пішуць. Калі ёсць страх, то толькі за тое, каб сем'і работнікаў нармальна жылі».

Прэзідэнт заявіў, што патрабаванне па павелічэнні зарплаты павінна быць няўхільна выканана. «Вядома, гэта асноўная задача для ўрада, але Нацыянальны банк не павінен стаяць убаку», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама падкрэсліў, што не менш важным з'яўляецца выкананне пастаўленых задач у галіне будаўніцтва, у тым ліку жыллёвага: «Гэта таксама пытанне не другараднае». «Праблему грашовага забеспячэння ваенных мы таксама павінны вырашыць, мы тут рухаемся, магчыма, трэба паскорыцца», — асабліва адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Надзея Ермакова далажыла Прэзідэнту аб рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі. Паводле яе слоў, сітуацыя ў эканоміцы і грашова-крэдытнай сферы, што склалася па выніках 5 месяцаў, сведчыць аб эфектыўнасці праводзімай палітыкі па макраэканамічнай стабілізацыі. Нацыянальная валюта ўмацавалася да карзіны замежных валют на 3,2 працэнта.

Прэзідэнт падкрэсліў, што роля Нацыянальнага банка ў развіцці эканомікі павінна ўмацоўвацца, і запатрабаваў, каб усе паказчыкі грашова-крэдытнай палітыкі былі безумоўна выкананы.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАКІРАВАЎ ЗАКОНАПРАЕКТ АБ АМНІСТЫІ Ў ПАЛАТУ ПРАДСТАЎНІКОЎ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў на разгляд у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу праект закона «Аб амністыі некаторых катэгорый асоб, якія ўчынілі злачынствы».**

Законапраектам прадугледжваецца вызваленне ад крымінальнай адказнасці і пакарання поўнасцю або часткова шэрагу катэгорый асуджаных. У ім рэалізаваны асноўныя прынцыпы крымінальна-прававой палітыкі, такія як законнасць, справядлівасць, гуманізм.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## ЛЮДЗЕЙ ТРЭБА ЎМЕЦЬ ВЫСЛУХАЦЬ, КАБ ПРЫНЯЦЬ РАШЭННЕ ПА ЗАКОНЕ

**Людзей трэба ўмець выслухаць, каб дакладна разабрацца ў сутнасці заявы і ў строгай адпаведнасці з літарай закона вырашыць узнятыя пытанні. Такое меркаванне выказаў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандр Якабсон, які правёў прыём грамадзян у Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе КДК.**

На працягу трох гадзін кіраўнік кантрольнага ведамства гутарыў з сямю чалавекамі (шэсць з якіх жывуць у Мінску), якія раней ужо звярталіся ў розныя інстанцыі са сваімі праблемамі, аднак так і не дабіліся жаданага выніку.

Пытанні, з якімі людзі прыйшлі на прыём да Аляксандра Якабсона, у асноўным, мелі жыццёвы характар.

Напрыклад, пажылы інвалід, які больш за паўстагоддзя пражывае ў Мінску ў зборна-шчытавым двухкватэрным доме без выгод, скардзіўся на шматгадовую адсутнасць капітальнага рамонту і дзейснай дапамогі з боку раённай жыллёва-эксплуатацыйнай службы.

Сталічны індывідуальны прадпрымальнік, з якім не прадоўжылі дагавор арэнды на рынку, выказаў сур'ёзныя прэтэнзіі ў адрас адміністрацыі гандлёвага цэнтра «Аквабел».

Адзін з субяседнікаў Аляксандра Якабсона прыехаў здалёк. Па просьбе 84-гадовай жыхаркі в.Хальч Веткаўскага раёна яе прадстаўнік папрасіў старшыню Камітэта дзяржкантролю разабрацца ў яшчэ адной жыццёвай гісторыі. Драма разыгралася вакол... шасці курыц, якіх быццам бы загубіў сабака бабулі. Так сказана ў адміністрацыйным пратаколе, складзеным участковым інспектарам. Далейшы разбор і звязаная з ім неабходнасць выплаты судовых выдаткаў, маральныя пакуты, — усё гэта цяжарам легла на плечы пажылой жанчыны, якая лічыць, што з ёй абышліся несправядліва.

Аб несправядлівай, на думку заяўніка, адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы праваахоўнымі органамі расказаў кіраўніку КДК і былы дырэктар сталічнага сумеснага прадпрыемства, хоць пракуратура, як наглядны орган, пацвердзіла абгрунтаванасць такога рашэння.

Уважліва абмеркаваўшы з заяўнікамі ўсе абставіны іх скаргаў, Аляксандр Якабсон не стаў абнадзейваць субяседнікаў, што праблемы адразу будуць вырашаны. «Людзей трэба ўмець выслухаць, — рэзюмаваў старшыня Камітэта дзяржкантролю, — з тым каб дакладна разабрацца ў сутнасці заявы і ў строгай адпаведнасці з літарай закона вырашыць узнятыя пытанні».

Па выніках прыёму грамадзян Аляксандр Якабсон канстатаваў: «Праблемы ёсць, будзем разбірацца, што можна зрабіць». Ён даў адпаведныя даручэнні спецыялістам Камітэта дзяржкантролю.

## ...І СОРАК САРАКОЎ РУЧНІКОЎ

**Міжнародны семінар на тэму захавання традыцый і развіцця новых відаў народных промыслаў пройдзе 15-16 чэрвеня ў Ганцавічах і Пінску. Да ўдзелу ў ім запрошаны навукоўцы, работнікі культуры, народныя ўмельцы з нашай і суседніх краін.**

Спачатку ў Ганцавічах пройдзе свята «Караваю майстры» і будзе адкрыта выстава вясельнага пасагу «Сорак саракоў ручнікоў». Сельсаветы Ганцаўшчыны прадставяць сваю традыцыйную культуру на яшчэ адной выставе пад умоўнай назвай «Наша малая Бацькаўшчына». У Ганцавічы прывязуць свае вырабы іванаўскія бондары, іншыя народныя майстры. Закончыцца насычаны семінарскі дзень этна-канцэртам «Рух зямлі», дзе будзе паказаны цэлы шэраг святочных абрадаў розных раёнаў Брэстчыны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## У ВАС КАНТРАКТ? ЗНАЧЫЦЬ, ПАВІННЫ БЫЦЬ ДАДАТКОВЫЯ МЕРЫ СТЫМУЛЯВАННЯ

**АМАЛЬ год таму, 1 чэрвеня 2011 года, уступіў у дзеянне Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 181, якім адменена абавязковае прымяненне АТС (адзінай тарыфнай стаўкі) у аплаце працы і пашыраны правы наймальнікаў у выбары сістэм аплаты працы, у тым ліку ўстанаўленні тарыфных ставак (акладаў) работнікаў, стымулюючых выплат і іх памераў. Учора ў рамках сумеснага інтэрактыўнага праекта Мінпрацы і сацыяльнай абароны Беларусі і БЕЛТА «Online-марафон: Праца і сацыяльная абарона» прайшла online-канферэнцыя «Практычнае прымяненне заканадаўства, якое рэгулюе пытанні аплаты працы ў рэальным сектары эканомікі».**

На пытанні, зададзеныя падчас online-канферэнцыі, адказала **начальнік галоўнага ўпраўлення працы і заработнай платы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Ірына КАЗЛІЦІНАВА.**

**В.В. МАРКАЎ, Мінск:** *Як разлічваць прадугледжаныя заканадаўствам павышэнні, надбаўкі, даплаты, прэміі ў камерцыйных арганізацыях, якія адмовіліся ад прымянення АТС? У прыватнасці, ці прымяняюцца «кантрактныя» павышэнні, прадугледжаныя Дэкрэтам Прэзідэнта ад 26.07.1999 № 29?*

Пры заключэнні кантракта з работнікам, незалежна ад ужывальных умоў аплаты працы (на аснове або без АТС), наймальнік абавязаны яму ўстанавіць дадатковыя меры стымулявання, прадугледжаныя Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 г. № 29, у выглядзе павышэння тарыфнай стаўкі (акладу) да 50 працэнтаў і дадатковага заахвочвальнага водпуску да 5 каляндарных дзён. Што тычыцца надбавак, даплат, прэмій і іншых выплат стымулюючага і кампенсавальнага характару, то парадак іх вылічэння ўстанаўліваецца наймальнікам самастойна ў лакальным нарматыўным прававым акце, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

**Віктар Анатольевіч, Мазыр:** *Ці мае права прыватная фірма прадугледзець у сваім палажэнні, што налічэнне і выплата ўзнагароджання па выніках працы за год ажыццяўляецца работнікам, якія знаходзяцца ў спісачным складзе арганізацыі на дату выплаты гадавога ўзнагароджання, г.зн. работнікі, якія звольніліся да прыняцця загаду аб выплаце гадавога ўзнагароджання, страцяць права на яго атрыманне?*

У адпаведнасці з артыкулам 63 ПК, дадатковыя выплаты стымулюючага характару работнікам, у тым ліку ўзнагарода па выніках працы за год, устанаўліваюцца наймальнікам на падставе калектыўнага дагавора, пагаднення і працоўнага дагавора. Такім чынам, пытанне ўстанаўлення парадку і падстаў выплаты названага ўзнагароджання знаходзіцца ў кампетэнцыі наймальніка.

**Гібкія сістэмы аплаты прымяняюцца ў 644 камерцыйных арганізацыях.**

**Мікалай Іванавіч, Орша:** *Якімі дакументамі рэгулюецца аплата працы работнікаў камерцыйных арганізацый?*

Для камерцыйных арганізацый такімі дакументамі з'яўляюцца: штатны расклад арганізацыі; палажэнні па аплаце працы работнікаў, стымуляванні працы работнікаў, а таксама іншыя палажэнні і іншыя лакальныя нарматыўныя прававыя акты; працоўныя дагаворы (кантракты), якія заключаюцца з работнікамі.

**Т.П. ФЁДАРАВА, г.Ліда:** *Ці можа аклад работніка камерцыйнай арганізацыі быць усталяваны ніжэй за памер мінімальнай заработнай платы?*

Так, аклад можа быць усталяваны работніку ніжэй, чым памер мінімальнай заработнай платы, калі ў налічанай заработнай плаце работніка ёсць, акрамя акладу, іншыя элементы заработнай платы (надбаўкі, даплаты, прэміі і іншыя выплаты). У тым выпадку, калі заработная плата работніка складаецца толькі з акладу і ў арганізацыі не прымяняюцца надбаўкі, даплаты, прэміі і іншыя выплаты, памер акладу не можа быць усталяваны ніжэй, чым мінімальная заработная плата.

**І.А. КІРЫЛІНА, Пінск:** *Ці можа камерцыйная арганізацыя адначасова ўжываць розныя сістэмы аплаты працы (напрыклад, для асобных катэгорый работнікаў — з ужываннем АТС, для іншых — без прымянення АТС)?*

Так, можа. Пры гэтым могуць быць устаноўлены нават персанальныя, індывідуальныя ўмовы аплаты працы для асобнага работніка (работнікаў), замацаваныя ў працоўным дагаворы (кантракце).

**Анатоль, Магілёўская вобласць:** *Ці можна ў адным працоўным дагаворы (кантракце) з работнікам устанавіць умовы аплаты працы, якія прадугледжваюць адначасова пагадзінную і здзельную формы аплаты працы?*

У працоўным дагаворы (кантракце), што заключаецца з работнікам, можа быць паказана адначасова і пачасовая, і здзельная форма аплаты працы. Пры гэтым наймальнік абавязаны арганізаваць улік рабочага часу па відах работ, якія аплачваюцца па здзельных расцэнках і пагадзінна.

**Галіна Р., Мінск:** *У дачыненні да супрацоўніка заведзена некалькі выканаўчых лістоў (аліменты спаганяюцца на пяцярых дзяцей ад розных шлюбаў), па кожным з якіх неабходна ўтрымліваць аліменты з заробку. Як не пакінуць супрацоўніка без сродкаў да існавання? Які гранічны памер утрымання аліментаў?*

У адпаведнасці з артыкулам 108 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, пры ўтрыманні з заработнай платы па некалькіх выканаўчых дакументах за работнікам павінна быць захавана не менш як 50 працэнтаў заробку.

**З 1 студзеня 2012 г. месячная мінімальная заработная плата ўстаноўлена ў памеры 1 млн рублёў, гадзінная — 5930 рублёў. У адпаведнасці з заканадаўствам, мінімальная заработная плата ў цяперашні час праіндэксавана на індэкс спажывецкіх цэн, і з 1 мая 2012 года памер месячнай мінімальнай заработнай платы складае 1047550 рублёў, гадзіннай — 6210 рублёў.**

**Святлана БУСЬКО.**

## БЕЛАРУСЬ ВЫСТУПАЕ ЗА СТВАРЭННЕ ХОЛДЫНГА НА БАЗЕ МАЗА І КАМАЗА НА ПАРЫТЭТНЫХ УМОВАХ

**Аб гэтым заявіў учора ў час двухбаковай сустрэчы са старшынёй урада Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым у Санкт-Пецярбургу прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, перадае БЕЛТА.**

Кіраўнік беларускага ўрада назваў працэс па стварэнні сумесных кампаній Беларусі і Расіі вялацякучым. «Можа, тут і наша ёсць недапрацоўка», — сказаў ён. У якасці прыкладу Міхаіл Мясніковіч прывёў адзін з буйнейшых праектаў дзвюх краін, якія прадугледжваюць зліццё МАЗа і КамАЗа. Паводле яго слоў, у выніку перагавораў з Дзмітрыем Мядзведзевым у Ашхабадзе па гэтым праекце былі дадзены даручэнні. Цяпер пытанне цаны не стаіць, трэба вызначыць ступень уваходжання ў гэты бізнэс», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Беларусь зацікаўлена ў зліцці дзвюх кампаній на парытэтных умовах. Будучая кампанія таксама павінна быць кіруемай. «Мы цяпер працуем з нашымі калегамі. Думаю, мы знойдзем варыянт», — дадаў Міхаіл Мясніковіч. Ён таксама папрасіў Дзмітрыя Мядзведзева пасадзейнічаць у вырашэнні гэтага пытання.

У сваю чаргу Дзмітрый Мядзведзеў таксама падкрэсліў станоўчыя тэндэнцыі ў развіцці расійска-беларускага ўзаемадзеяння. Краіны дабіліся вельмі нядрэнных вынікаў, нягледзячы на трывожную сітуацыю на сусветных эканамічных рынках. Разам з тым разгляду і кансультацый патрабуе шэраг пытанняў.

## НЕАБХОДНА СІСТЭМНАЯ РАБОТА ПА СТВАРЭННІ ЭКСПАЗІЦЫІ МУЗЕЯ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**Да такой высновы прыйшлі ўдзельнікі нарады, якая прайшла ў Савеце Міністраў пад кіраўніцтвам намесніка прэм'ер-міністра Анатоля Тозіка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.**

Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны распрацаваў і зацвердзіў навуковую канцэпцыю музейнай экспазіцыі, яе архітэктурна-мастацкае рашэнне. Падрыхтаваны неабходныя матэрыялы па правядзенні конкурсу на тэхнарабочую дакументацыю па стварэнні экспазіцыі. Разам з тым Анатоль Тозік указаў на адсутнасць сістэмнай работы з боку Міністэрства культуры і ДУ «Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны» па стварэнні музейнай экспазіцыі, а таксама каардынацыі і ўзаемадзеянні па ўвязцы экспазіцыі з інтэр'ерамі музея.

На нарадзе вызначаны тэрміны правядзення конкурсу на стварэнне музейнай экспазіцыі і аб'яўлення яго вынікаў. Плануецца, што заказчыку будаўніцтва будынка Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны КУП «УКБ Мінгарвыканкама» рабочыя чарцяжы па афармленні першай залы музея будуць выдадзены 12 жніўня гэтага года. У рабоце нарады ўзялі ўдзел кіраўнікі Мінкультуры, Мінгарвыканкама, УП «Мінскгорада», ААТ «Будтрэст № 1».

■ Наш фармат

## СЯРОД ПРЭТЭНДЭНТАЎ НА ДЗІЦЯЧАЕ «ЕЎРАБАЧАННЕ» НАЙБОЛЬШ МІНЧАН І МАГІЛЁЎЦАЎ

**ПРЫЧЫМ Міншчына лідзіравала яшчэ на адборачным этапе. З 54 заявак, што прыйшлі на адрас аргкамітэта рэспубліканскага дзіцячага конкурсу «Песня для Еўрабачання», амаль палова — 26! — з Мінска, яшчэ 3 — са сталічнай вобласці. З рэгіёнаў самай актыўнай была Магілёўшчына — 7 заявак. Затое ў фінальнай дзясятцы аказаліся ўсяго 3 удзельнікі з Мінска і ажно 3 — з Магілёва. Таксама прайшлі ў фінал конкурсу 3 прадстаўнікі Гомельскай вобласці (з Гомеля, Мазыра, Светлагорска) і 1 — сталічнай (з Маладзечна).**

Сярод фіналістаў, акрамя сольных выканаўцаў, ёсць дуэт, трыа і ансамбль з 6 удзельнікаў:

Мінск — Канаплянік Антоній (11 гадоў), Жашко Ягор (12 гадоў), ансамбль «Заранак» (6 дзяцей ва ўзросце 10—12 гадоў);

Магілёў — Трубяцкая Ганна і Шушкоў Цімур (13 гадоў), Круглік Ірына (11 гадоў), Шапялевіч Валерыя (13 гадоў);

Гомель — Прахарэнка Тацяна (13 гадоў), Мазыр — Атрошчанка Юлія (13 гадоў), Светлагорск — трыа «Дзеці сонца» (13—15 гадоў), Маладзечна — Атрашэнка Дар'я (11 гадоў).

— Наколькі цяжка было выбіраць гэтых дзесяцярых з больш як паўсотні? — пацікавілася «Звязда» ў нязменнага куратара адбораў на дзіцячае «Еўрабачанне», выканаўчага прадзюсара тэлеканала «Беларусь-2» Людмілы Барадзіной.

— У адпаведнасці з палажэннем конкурсу, спачатку прафесійнае журы з 8 чалавек (у яго ўвайшлі прадстаўнікі міністэрстваў культуры і адукацыі, тэле- і радыёканалаў, вядомыя выканаўцы) на чале з народным артыстам Беларусі, кампазітарам Эдуардам Зарыцкім адслухала абсалютна ўсе дасланыя «плюсавыя» кампазіцыі і адабрала 13 канкурсантаў для жывога праслухоўвання пад «мінусавыя» фанаграмы. З гэтых 13 у фінал прайшлі 10. Агульнае ўражанне, якое ў нас склалася пасля праслухоўвання, — што дзяцей, моцных у вакальным плане, больш, чым добрых песень. Прасочваўся, на жаль, і негатыўны ўплыў дарослых — аўтараў, кампазітараў, аранжыроўшчыкаў — у тым сэнсе, што некаторыя песні былі больш дарослымі за свайго выканаўцу, ці, наадварот, занадта просценькімі для артыста. Але ўсе гэтыя заўвагі і парады журы ўжо выказала канкурсантам, педагогам і бацькам. Цяпер у іх ёсць цэлае лета для «дамашняга задання». У верасні на фінальным канцэрце пачуем і ўбачым, што атрымалася.

Вераснёўскі фінальны канцэрт «Песні для Еўрабачання» будзе трансляваецца ў прамым эфіры канала «Беларусь 1». Пераможцу рэспубліканскага конкурсу — і, адпаведна, прадстаўніка Беларусі на дзіцячым «Еўрабачанні-2012» — абяруць сумесна тэлегледачы і прафесійнае журы.

Сам жа міжнародны дзіцячы песенны конкурс, нагадаем, пройдзе ў снежні гэтага года ў Амстэрдаме (Нідэрланды).

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**



## МІСІЯ ДЛЯ КАТА ЛЕАПОЛЬДА

**Вылучыць з агульнай карціны буйных спартыўных форумаў галоўную падзею часам бывае цяжка. Тым больш, калі сенсацыя поруч з фартунай пакуль толькі выбірае, з каго жорстка пажартаваць, а каго ўзнесці. З польска-ўкраінскім Еўра-2012 зараз прасцей. Бо не футбол, на жаль, на гэтым тыдні валодае «розумамі».**

З фаварытаў пакуль расчароўваюць толькі галандцы. Завадны апельсін, напэўна, проста не паспелі завесці. Адчуванне такое, што «аранжавыя» зараз існуюць у іншай рэчаіснасці. Два паражэнні ад датчан і немцаў на старце — і яны амаль з квіткамі ў амстэрдамскі аэрапорт «Схіпхол». Каб змяніць становішча, галандцам неабходна перамагаць партугальцаў і спадзявацца на вікторыю Германіі ў матчы з датчанамі.

А пакуль у Харкаве галандскі коўч Берт ван Марвік вырашае дылему Чарнышэўскага «Што рабіць?», у Варшаве мясцовыя «інтэлектуалы» з асяродку ультрас 12 чэрвеня вырашылі не разважаць, а дзейнічаць... Кулакамі і нагамі. Аб'ектам іх вялікай і шчырай увагі прадказальна сталі рускія балельшчыкі, якія прыехалі падтрымаць сваю зборную на матч з гаспадарамі.



Пра дзівосы «руса турыста» ў Еўропе ўжо можна здымаць фільм, не горшы за разанаўскі «Неверагодныя прыгоды італьянцаў у Расіі». Гісторыя пра тое, як расійскія заўзятары калісьці ў маленечкай і кволай на сельгаспадарку Андоры пазбавілі фермера Пепэ яблычнага ўраджаю, а пасля кідаліся яблыкамі — дзіцячыя жарты. Нядаўна група «храбрых» маладых людзей наогул расправілася з валанцёрамі на стадыёне ва Уроцлаве пасля гульні з чэхамі. Аднак маразм мацнеў. Яшчэ загадзя руская фан-армада вырашыла правесці марш балельшчыкаў да Нацыянальнага стадыёна ў Варшаве ў дзень гульні з Польшчай. Ідэя, між іншым, з шэрагу тых, пра якія круцяць пальцам каля скроні. Які марш? Марш каго? Трыумфатараў-пераможцаў? І дзе? У Маскве, Піцеры? Адчулі ўвесь драматызм сітуацыі госці толькі на сваіх рэбрах, калі ашалелыя палякі ганялі па мосце Панятоўскага з большага звычайных бяскрыўдных балельшчыкаў, а не рускіх бузацёраў. Нагадала ўсё гэта старыя сельскія танцы, калі мясцовыя дурні кідаліся з кулакамі на нечаканых візіцёраў з гарадка. Увесь жах сітуацыі выклікала і тое, што сярод «маршыруючых» былі і жанчыны, і дзеці, што набывае зусім іншы каленкор. На шчасце, усе жывыя, а паліцыя затрымала больш за сотню ашалелых малодчыкаў. Цяпер іх судзяць. Але ўсё роўна гэта не стапрацэнтная гарантыя таго, што рускіх не працягнуць пераследаваць і надалей. Тым больш зборнай Расіі яшчэ гуляць на польскай зямлі.

Уся сітуацыя мне нагадала 1997-ы год, Мінск. Тады разам з татам я ўпершыню трапіў на матч беларускай зборнай з камандай Шатландыі. Балельшчыкі на поўначы Брытаніі таксама не цукровыя. Толькі канфрантацыя там на ўзроўні канфесіянальным: пратэстанты супрацьстаяць каталікам. Але галоўная праблема шатландцаў была ў тым, што ад выпітага піва ім даводзілася шукаць прыбіральні ў бліжэйшых ад «Дынама» дворыках — а гэта выклікала абурэнне ў мінчан. І чамусьці яны не верзлі бязглуздзіцу, фаеры на поле не кідалі, з беларусамі не біліся. Выглядалі добрымі дзядзькамі ў клетчатых кілтах, гатовымі ісці на кантакт з кожным стрэчным. Вобраз п'яных дэбашыраў і хуліганаў рускім трэба мяняць адназначна. Паўсюль знойдуцца тыя, хто за жорсткасць адкажа падвоенай жорсткасцю. Варшаўскія радыкалы гэта даказалі. Правілы жыцця даволі простыя... Для ката Леапольда з'явілася сапраўдная праца. Мацуйся!

**Тарас ШЧЫРЫ.**

**P.S.** ***У чацвер стаў вядомы першы няўдачнік чэмпіянату. Іспанцы ў групе С адправілі ў накдаўн Ірландыю — 4:0. У выніку падапечныя Джавані Трапатоні згубілі ўсе шанцы, каб прайсці далей. Італьянцы згулялі ўнічыю з харватамі — 1:1.***

### АБЗАЦ

**◢ У гэтыя выхадныя (16—17 чэрвеня) у Мядзельскім раёне пройдзе 7-я рэспубліканская выстава-кірмаш народных рамёстваў і промыслаў «Камарова — кола дзён 2012». Арганізатары — Мінскі абласны выканаўчы камітэт, Дэпартамент па прадпрымальніцтве Мінэканомікі, Мядзельскі раённы выканаўчы камітэт, ТДА «Цэнтр развіцця сельскага прадпрымальніцтва «Камарова». Падчас выставы-кірмашу будуць прадэманстраваны работы рамеснікаў, праведзены майстар-класы па ганчарнай і кавальскай справе, пляценні з лазы, бяросты, саломы.**

◢ Жанчына з цвіком у галаве звярнулася па дапамогу да медыкаў у Клічаўскім раёне і была шпіталізавана ў раённую бальніцу. Рабочая ТДА 1973 г.н. атрымала траўму на працоўным месцы ў в.Бацэвічы. Папярэдне ўстаноўлена, што цялеснае пашкоджанне па неасцярожнасці з цвіказабіўнога пнеўмапістолета ёй прычыніла мясцовая жыхарка. Праводзіцца праверка.

### ПОЎНЫ АБЗАЦ



**◢ У Шатландыі 9-гадовай дзяўчынцы-блогеру забаранілі выкладваць фатаграфіі яе школьных абедаў, якія сталі сусветным хітом у інтэрнэце. Марта Пэйн выкладвала фатаграфіі на сваім вэб-сайце і ставіла адзнаку па 10-бальнай шкале, ацэньваючы, наколькі здаровай з'яўляецца прадстаўленая на іх ежа. Мясцовыя ўлады запатрабавалі ад яе перастаць выкладваць здымкі ў інтэрнэце пасля таго, як выданне Daily Record апублікавала фота з блога Марты з адным са школьных повараў пад загалоўкам: «Час выганяць тых, хто падае абед у школе». Па словах прадстаўнікоў мясцовых улад, асвятленне блога дзяўчынкі ў прэсе выклікала ў работнікаў школьнай сталовай боязь магчымай страты месца працы.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

■ Запрашальны білет

## «...З ЁЮ — БЛІЗКАЙ ДА ЛЮДЗЕЙ — І НАДЗЕЙНЕЙ, І СВЯТЛЕЙ!»

**«Звяздзе» 95-ы... Няшмат газет могуць пахваліцца такім паважаным узростам!**

Але ж не столькі ён падставай для гонару, колькі — падпісчыкі. «Добры дзень, дарагая «Звязда», — піша ўжо знаёмая нам **Галіна Мечыславаўна ШУКЕЛА з Мядзела.** — Найперш дазволь падзякаваць за сустрэчу, якая адбылася ў нас у горадзе, за прэзентацыю газеты, за прыгожую родную мову, за шчырасць і добры народны гумар, за памятныя падарункі. «Звязда» разам з радыё сапраўды нясуць беларускасць у нашы дамы і душы, сапраўды прасвятляюць, сапраўды памагаюць...

У нашай сям'і быў час, каб у гэтым упэўніцца: старэйшую беларускую газету спачатку выпісваў мой бацька, цяпер я, а чыталі і чытаем (ужо больш за 35 гадоў) усёй сям'ёй. Падабаюцца рубрыкі «Краіна здароўя», «Хатняя энцыклапедыя», «Хроніка апошніх падзей», чакаем артыкулаў Валянціны Доўнар, Сяргея Расолькі, Ларысы Цімошык, Ілоны Івановай, вершаў Яўгена Пясецкага...

Я таксама люблю нешта зрыфмаваць. Вось што атрымалася пасля сустрэчы:

*Усёй краіне я скажу:*
*Са «Звяздой» — даўно дружу!*
*З ёю — блізкай да людзей —*
*І надзейней, і святлей!»*

*Дзякуй шаноўнай Галіне Мечыславаўне за добрыя словы! Дзякуй усім, хто падзяляе яе пачуцці і погляды, хто таксама выпісвае старэйшую беларускую газету. У традыцыях якой не толькі прыходзіць да сваіх чытачоў, але і прыязджаць. Так-так —* ***у аўторак, 19 чэрвеня з 11 да 17 гадзін прадстаўнікі «Звязды» будуць чакаць сваіх падпісчыкаў на сталічным Галоўпаштамце.***

*У той жа дзень і той жа час —* ***у аўторак, 19 чэрвеня, у 11 гадзін пачнецца прэзентацыя нашага выдання ў актавай зале Асіповіцкага райвыканкама.***

*Прыходзьце!*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ З 20 ЧЭРВЕНЯ — 32 ПРАЦЭНТЫ

Стаўка рэфінансавання ў Беларусі з 20 чэрвеня 2012 года зніжаецца да 32 працэнтаў гадавых. Адпаведнае рашэнне прынята праўленнем Нацыянальнага банка, паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка. Адначасова зніжаецца працэнтная стаўка па пастаянна даступных аперацыях падтрымкі ліквіднасці (крэдыт овернайт, СВОП овернайт) і двухбаковых аперацыях (ламбардны крэдыт, здзелкі СВОП) з 55 працэнтаў да 50 працэнтаў гадавых.

### КОШТ АКЦЫЗНЫХ МАРАК НА АЛКАГОЛЬ І ТЫТУНЬ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА Ў БЕЛАРУСІ З 1 ЛІПЕНЯ

Кошт акцызных марак для маркіроўкі алкагольных напіткаў і тытунёвых вырабаў будзе павялічаны ў Беларусі з 1 ліпеня бягучага года. Такое рашэнне змешчана ў пастанове Міністэрства эканомікі № 46, тэкст якой размешчаны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, паведамляе БЕЛТА. Згодна з дакументам кошт акцызнай маркі для маркіроўкі алкагольных напіткаў з 1 ліпеня вырасце на 47,1 працэнта і складзе Br250, для маркіроўкі тытунёвых вырабаў павялічыцца на 43 працэнты да Br100.

### УКРАЛІ 100 КІЛАГРАМАЎ КАРПА

У Жабінцы ноччу затрымалі трох грамадзян, якія на аўтамабілі перавозілі мяхі з рыбалоўнымі сеткамі і рыбай.

— Пры праверцы было ўстаноўлена, што гэтыя людзі пры дапамозе чатырох стаўных сетак агульнай даўжынёй 458 метраў укралі з сажалак «Рыбгаса «Сакалова» 100 кілаграмаў карпа. Канфіскаваную рыбу, кошт якой удакладняецца, вярнулі ў рыбгас, — расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У гэты ж дзень апоўдні паблізу вёскі Асмаловічы Кобрынскага раёна на прасёлкавай дарозе быў спынены для праверкі яшчэ адзін аўтамабіль. У яго салоне знайшлі шэсць поліпрапіленавых мяхоў са свежай азёрна-рачной рыбай у сетках. Праверка засведчыла, што пасажыры аўтамабіля напярэдадні на вадаёме паблізу торфазавода каля вёскі Кустовічы Кобрынскага раёна пры дапамозе дваццаці сетак па 40 метраў кожная незаконна здабылі 274 асобіны розных відаў рыб агульнай вагой 100 кілаграмаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА, Яна СВЕТАВА.**

■ Нашчадкі вогненных вёсак

# ДЗЕНЬ ДАЛЬВЫ



## Сёння пройдзе Акцыя Памяці трагедыі Дальвы

19 чэрвеня 1944 года фашысты знішчылі вёску Дальва — зажыва спалілі 44 яе жыхароў: 29 дзяцей, 13 жанчын, 2 мужчын.

Гэта была апошняя з 628 беларускіх «вогненных вёсак» Вялікай Айчыннай вайны, якія паўтарылі трагічны лёс Хатыні. Дальва загінула, калі да вызвалення заставаліся лічаныя дні...

Пасля вайны на месцы спаленай вёскі жыццё так і не адрадзілася. Але Дальва засталася — як вёска-помнік. У 1973 годзе быў адкрыты мемарыял «Дальва». Знішчаная, пахаваная вёска пачала сваё другое жыццё...

А ўзводзіўся мемарыял у Дальве, што называецца, «на грамадскіх пачатках». Ініцыятарам і «рухавіком» гэтай справы быў Мікалай Гірыловіч. Ён, падлетак, цудам застаўся жыць. І сваё жыццё ўспрымаў як місію — захаваць памяць пра загінулых аднавяскоўцаў. Мемарыял у Дальве — гэта помнік і яму, Мікалаю Пятровічу Гірыловічу, які здзейсніў вялікі сыноўні і грамадзянскі подзвіг.

У Дальве ўстаноўлены камень з тэкстам — нібыта спаленыя фашыстамі людзі просяць у нашчадкаў прабачэння, што не могуць гасцінна сустрэць у вёсцы:

*Спаліў нас вораг чэрвеньскай парою —*
*Дзядоў, жанчын, падлеткаў і дзяцей.*
*Даруйце, людзі добрыя, за тое,*
*Што вас не сустракаем як гасцей.*

Сёння ў Дальве будзе шмат гасцей. Пройдзе мітынг-рэквіем, адбудзецца жалобнае богаслужэнне.




Арганізатарамі Акцыі Памяці выступілі Мінскі аблвыканкам, Белтэлерадыёкампанія, Лагойскі райвыканкам, мемарыяльны комплекс «Хатынь», Мінскае абласное аддзяленне Беларускага фонду міру.

**Таццяна ПАДАЛЯК**

■ У суседзяў

# ЧАМУ ПЕНСІЯНЕРЫ ЛІТВЫ АДЧУВАЮЦЬ СЯБЕ ПАКРЫЎДЖАНЫМІ?




Адзін з многіх мітынгаў пратэсту ў Вільнюсе.

**Неяк зайшоў да суседа, а ён на мяне не звяртае ніякай увагі, увесь паглыбіўся ў нейкія разлікі і з абурасцю бурчыць:**

— Як мне дагнаць гэтую пенсію?

Такое пытанне сёння сабе задаюць усе жыхары Літвы, якія набліжаюцца да пенсійнага ўзросту. Справа ў тым, што цяперашні ўрад кансерватараў вырашыў перакласці негатыўныя наступствы эканамічнага крызісу, у тым ліку, і на плечы пенсіянераў. Калі пачаліся эканамічныя цяжкасці, урад вырашыў, што ў Літве занадта шмат пенсіянераў і што яны атрымліваюць занадта вялікія пенсіі. Адгэтуль — дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту, які павялічваецца, і недахоп сродкаў на ахову здароўя, асвету і падобнае.

Каб зменшылася колькасць пенсіянераў, было вырашана павялічыць пенсійны ўзрост. Тут трэба падкрэсліць, што пенсійны ўзрост для мужчын у 60 гадоў, а жанчын — 55, які існаваў у савецкі час, у Літве ўжо даўно забыты. Да пачатку 2012 года мужчыны выходзілі на пенсію ва ўзросце 62,5 года, жанчыны ў 60 гадоў. А летась Сейм Літвы прыняў новы закон дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, які зраўняў пенсійны ўзрост жанчын і мужчын і павысіў яго да 65 гадоў.

Гэтаму закону пярэчылі многія. 85% літоўцаў не ўхваляюць павышэнне пенсійнага ўзросту — такія былі вынікі рэпрэзентатыўнага апытання, праведзенага па ініцыятыве навукоўцаў Каўнаскага тэхналагічнага ўніверсітэта. Толькі 2% рэспандэнтаў выказаліся, што цалкам ухваляюць павышэнне пенсійнага ўзросту, яшчэ 7% пацвердзілі, што ўхваляюць гэты праект, а 6% не змаглі адказаць на пастаўленае пытанне.

— Цікава, што гэтую ідэю падтрымліваюць маладыя людзі да 37 гадоў і людзі старэй за 68 гадоў. Для першых вынік такога рашэння — у далёкай будучыні, таму яны схільныя ацэньваць яго больш спрыяльна. А для другіх рашэнне Сейма зусім не будзе мець ніякага наступства, — каментавала вынікі даследавання дацэнт Аўдроне Целешэне.

— Павышэнне пенсійнага ўзросту без стварэння новых працоўных месцаў можа павялічыць эміграцыю, — лічыць віцэ-старшыня Сейма, член фракцыі апазіцыйнай Партыі працы Віргінія Балтрайтэне. — Думаю, што больш позні выхад на пенсію стане яшчэ адной падставай для нашых маладых людзей з'ехаць з Літвы. Чалавек, які не атрымлівае прыстойнай пенсіі, будзе імкнуцца працаваць незалежна ад таго, ці дазваляе яму здароўе, а для маладога спецыяліста проста не будзе працоўнага месца.

Улічваючы негатыўнае стаўленне большасці насельніцтва і жадаючы пазбегнуць шокавага стану, урад гэты закон стаў уводзіць паступова. З 1 студзеня 2012 года пенсійны ўзрост пачалі павышаць для жанчын на 4 месяцы, а для мужчын — на 2 месяцы штогод з тым, каб да 2026 года і мужчыны, і жанчыны ішлі на пенсію ўжо ў 65 гадоў.

Апублікавалі і мудрагелістую табліцу падаўжэння пенсійнага ўзросту. Напрыклад, калі жанчына нарадзілася да 31 жніўня 1952 года, яна зможа выйсці на пенсію ў 2012-м, маючы 60 гадоў і 4 месяцы ўзросту, мужчына — 62 гады і 8 месяцаў. А калі вы нарадзіліся пасля 31 жніўня 1952- га, то на пенсію зможаце выйсці толькі ў 2013 годзе, калі жанчына дасягне 60 гадоў і 8 месяцаў, а мужчына — 62 гады і 10 месяцаў.

Над гэтай табліцай і варажыў мой сусед, падлічваючы свае месяцы.

— Калі я нарадзіўся ў канцы 1953 года, то на пенсію змагу выйсці толькі ў 2014-м, калі мне стукне 63 гады, — бязрадасна канстатаваў ён.

Урад Літвы, пад кіраўніцтвам прэм'ер-міністра Андруса Кубілюса, ударыў і па кішэні пенсіянераў. У мэтах паніжэння дэфіцыту Фонду дзяржаўнага сацыяльнага страхавання («Содра») урад, нягледзячы на тое, што ў Літве самыя маленькія пенсіі ў Балтыйскім рэгіёне, у 2010 годзе да 10 % знізіў пенсіі па старасці і інваліднасці.

Яшчэ больш пацярпелі пенсіянеры, якія працуюць. Ім была рэзка абмежавана выплата пенсій. Улады разважалі так: калі ты атрымліваеш зарплату і пенсію, то можаш пражыць і за адну зарплату. Пенсію зрэзалі прапарцыянальна зарплаце. Чым большая зарплата, тым больш скарачалі пенсію. Яе маглі паменшыць на 50 і больш працэнтаў.

Гэтая ўзаконеная самаўпраўнасць сустрэла рэзкае супраціўленне грамадскасці. Людзі не раз выходзілі на мітынгі перад парламентам, пратэстуючы супраць паніжэння пенсій і эканамічнай палітыкі ўрада, якая прывяла некаторых на мяжу галечы.

На адным з мітынгаў я запісаў словы, напісаныя на плакатах пратэстуючых: «Пенсія — гэта нашы пот і кроў», «Кубілюса — на пенсію без пенсіі!», «Чым чалавеку горш, тым кансерватарам лепш?», «Зароблeная пенсія — гэта маёмасць чалавека!», «А. Кубілюс! Чакаем вашай адстаўкі!»

Артурас Паўлаўскас, былы старшыня Сейма, а цяпер лідар непарламенцкай партыі «Новы саюз», якая арганізавала адзін з такіх мітынгаў, абвінаваціў улады ў амаральнай палітыцы. Паводле яго слоў, лепш залезці ў дзяржаўны доўг, чым у кішэнь да пенсіянераў.

Гэтыя рашэнні ўрада былі абскарджаны і ў Канстытуцыйным судзе. Суд пастанавіў, што ўлады парушылі Канстытуцыю Літвы і павінны кампенсаваць пенсіянерам скарочаныя пенсіі. Урад пайшоў на ўступкі. З 2012 года пенсіі вярнуліся на дакрызісны ўзровень. Абвешчана, што двухгадовае скарачэнне пенсій урад плануе кампенсаваць тады, калі бюджэт «Содры» будзе збалансаваны. Чакаецца, на кампенсаванне пенсій будзе вылучана 1,2 млрд літаў, а выплачаны яны будуць на працягу пяці гадоў.

Цяпер сярэдняя пенсія ў Літве складае 768 літаў (прыкладна 222 еўра — **«Зв.»**). Улічваючы пастаянны рост цэн на прадукты першай неабходнасці, камунальныя паслугі, грамадскі транспарт, гэта вельмі маленькая сума. Я нярэдка бываю ў Мінску, таму магу з упэўненасцю сказаць, што ў Беларусі прадукты харчавання амаль удвая таннейшыя, лекі — у 2-3 разы. Звычайны аднаразовы квіток на тралейбус ці аўтобус у Вільнюсе каштуе 2 літы — гэта значыць, больш за 0,5 еўра. Узімку толькі за ацяпленне я, маючы трохпакаёвую кватэру, плаціў па 800-900 літаў у месяц (230—260 еўра). Цэны на электрычнасць, прыродны газ апошнім часам павялічваліся некалькі разоў. Зараз 1 кілават электраэнергіі каштуе 0,45 літа, 1 куб. м. прыроднага газу — 2,15 літа. У выніку такой эканамічнай палітыкі адзінокаму пенсіянеру, які атрымлівае сярэднюю пенсію, цяпер у горадзе пражыць амаль немагчыма.

Жадаючы зэканоміць за кошт пенсіянераў, урад пайшоў на новыя прыдумкі. З 2012 года ў сілу павінны былі ўвайсці папраўкі да закона аб дзяржаўным сацыяльным пенсійным страхаванні, згодна з якімі чалавек, які выходзіць на пенсію, можа выбраць пяць лепшых гадоў свайго працоўнага стажу або з савецкага перыяду, або за час пасля набыцця Літвой незалежнасці. Аднак урад яшчэ раз вырашыў адтэрмінаваць яго ўваходжанне ў сілу. Па падліках Міністэрства сацыяльнага забеспячэння і працы Літвы, гэтыя папраўкі запатрабуюць дадаткова 130 млн літаў. Урад лічыць, што гэта занадта шчодры крок. Таму міністэрства прапанавала лічыць пенсіі новым пенсіянерам без уліку савецкага перыяду, толькі з 1994 года, але з улікам усяго працоўнага стажу.

Прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ заявіла, што наклала б вета на закон, згодна з якім новым пенсіянерам падлічвалі б пенсію, не ўлічваючы даходы савецкага перыяду. Паводле слоў Д. Грыбаўскайтэ, пры падліку памеру пенсіі ў жыхароў Літвы павінна быць магчымасць выбару лепшых пяці гадоў за час усяго працоўнага стажу.

Закон, які прадугледжвае выбар пяці лепшых гадоў са стажу, быў прыняты ў 2007 годзе. Але яго ўваходжанне ў сілу неаднаразова адкладвалася.

Вось чаму многія пенсіянеры адчуваюць сябе пакрыўджанымі. Большасць жыхароў лічыць, што ў Літве людзям не забяспечваюць годную старасць.

— Годныя пенсіі пенсіянеры Літвы змогуць атрымаць толькі праз некалькі дзясяткаў гадоў, — лічыць прэм'ер-міністр Літвы Андрус Кубілюс.

Гэтыя словы прэм'ера мала каго суцяшаюць.

**Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,**
**уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве.**
**Фота аўтара.**

*Вільнюс.*

■ Простая мова

# АДЗІН ДЗЕНЬ...

**...У калегі цешча цікавая. Цікавая тым, што (магчыма, як многія?) гаворыць нават тады, калі мозг адпачывае. Ну вось пачуйце (з тэлефоннай трубкі, ды ўрачыстае...):**

**— То-лі-чак (Толічку ў той дзень 50)! Ты ў нас маладзец! Ты ў нас разумнік! Ты цудоўна ведаеш: твае лепшыя гады — ужо таго... даўно мінулі. Віншую цябе! Жадаю...**

**Не ведаю, ці запомніць зяць хоць што з пажаданняў. А вось уступ...**

**Знаёмы будаўнік прызнаў: калі ты гарбатаму скажаш, што ён гарбаты, то, далібог, не схлусіш!**

**Ды навошта яму твая праўда?**

## ПАДМАН

У той кватэры ўсе вокны былі ў фіялках — махровых, не махровых, стандартных, мініяцюрных, ці не ўсіх адценняў сіняга (да таго ж у крапінку, з жоўтым «вочкам»...) і чырвонага (з аблямовачкай...). Цешылі вочы, бо цвілі — ну ўвесь час! І гадамі...

Таму ці не з кожнай кветачкі гаспадыня наадразала лісточкаў, наставіла іх у ваду — прычакала флянсаў. І найлепшыя з іх пасадзіла — у новыя гаршчэчкі, у спрыяльны дзень і ў добрую зямлю.

Не дзіва, што яны прыжыліся, што вясной і ўсе — зацвілі. Пераважна... ружовым.

## ДВОЕ

Гэта банальна, гэта — не так цікава...

Пытання, чым карміць немаўля, у сям'і не стаяла. Ну, вядома ж, грудным малаком. Маці, каб лепш яно прыбывала, старалася болей піць (сокаў, кісялёў, кампотаў, гарбаты...) і болей есці.

Паўнела паступова і спярша ледзь заўважна: падумаеш — насіла 44-ы памер адзення, а праз паўгода ўжо 48-ы. Хто на гэта зважаў — іншых турбот хапала: у Наташы ўвесь час хварэла дзіця, пастаянна бракавала грошай. І гэтак жа пастаянна, жывучы ў адной кватэры, зяць сварыўся з цешчай. Што крыўдна было — на роўным месцы, з-за драбязы і пры гэтым так, што ўсё часцей і часцей ляпаў дзвярыма і тыднямі затым не прыходзіў дамоў. Жонцы казаў, што начуе ў сваіх, а высветлілася...

Тая, другая, з якой ён кахаўся, была нашмат маладзейшай. І стройнай...

«Трэба пахудзець, — выліўшы мора слёз, рашыла Наташа. — І тады ён вернецца».

Першыя чатыры дні галадання даліся ёй вельмі цяжка! На пяты — крыху палягчэла, на сёмы, паглядзеўшы ў люстэрка, яна ўжо святкавала, бо бачыла, што мэта выканальная! Яшчэ крыху, і яна «ўлезе» ў свае дзявочыя рэчы, у свой 44-ы памер! Муж, адпаведна, гэта ўбачыць. І не будзе разбураць сям'ю — не пакіне малога, не стане адмаўляцца ад яе.

Адзінае... Аднекуль — аднекуль з падсвядомасці — на дзясяты дзень галадоўкі і раптам выплыла пытанне: «А мне гэта трэба?»... І тут жа, адтуль жа, з'явіўся адказ: «Не!», бо «разуліся» вочы, і Наташа з жахам убачыла, што чатыры з лішкам гады пражыла (даслоўна) «з г-ом»: з драбязным, гультаяватым, неразумным чалавекам — не гаспадаром, не мужчынам... Ён здрадзіў ёй? Ён падаўся да іншай? Дык і лёгкай дарогі: «Уж лучше голодать, чем что попало есть, и лучше быть одной, чем вместе с кем попало».

Яны хутка раз'ехаліся — спакойна развяліся...

(Што, напэўна ж, цікава: яна пасля гэтага выйшла замуж за вельмі прыстойнага чалавека, нарадзіла яшчэ адно дзіця, жыве...

Былы муж (17 гадоў прайшло!) так і не жаніўся.)

## СВАЕ

Раніца, аўтобус — пад'ехаўшы да чарговага прыпынку, ён расчыняе дзверы, падбірае... «бочку і бочачку»: дужа поўную, пажылую жанчыну і акурат такога ж сабачку. Цяжка, паволі (першай — кабета) яны падымаюцца па прыступках, марудна, у перавалку кіруюць да вольнага месца. Жанчына садзіцца.

— Сюды! Пад лаўку, — загадвае сваймy спадарожніку.

Той чуе. І першую каманду нават выконвае, а вось другую... Умольна, не міргаючы, глядзіць на гаспадыню: можа, не трэба?

— Пад лаўку! — грозна паўтарае тая.

Сабака (ну што тут будзеш рабіць?) — слухаецца: пакорліва лезе, куды сказалі, але ж, так бы мовіць, не ўвесь: з-пад лаўкі (а дакладней, з-пад спадніцы сваёй гаспадыні) ён высоўвае цікаўную мордачку, нахіляючы яе то ў гэты бок, то ў другі, разглядае людзей...

Што яны? У большасці — нуль эмоцый: глядзяць за акно, чытаюць, размаўляюць па мабільніках, дрэмлюць...

Але ж ёсць і тыя, што не зводзяць вачэй з жанчыны (а больш, вядома, з сабакі), тыя, што, гледзячы на «салодкую парачку», хораша ўсміхаюцца — самі сабе, адзін аднаму, і такім вось чынам... яднаюцца, ствараюць свайго роду суполку — дабракоў, аднадумцаў...

Адну з той кагорты — і ледзь не назаўтра — у вясковую хату занесла. Каб дагадзіць гаспадару, схапіла вядро, пабегла да суседскай студні — набраць вады. Толькі на вуліцу — грузавік насустрач.

Стала, як укапаная (бо благая ж прыкмета), у міг вока схавала за спінай пустое вядро...

Але ж кіроўца ўгледзеў гэты «манеўр» — на ўсе 32 заўсміхаўся і, пад'ехаўшы бліжэй, аж да руля схіліў галаву. Падзякаваў.

Свой.

## БЕЗ ДЗЯДУЛІ

«Санта Барбара»!

Нарадзіўшыся ў вялікай сям'і, Аляксей і сваю хацеў мець такую ж, гэта значыць, шмат працаваць, шмат зарабляць і гадаваць траіх, чацвярых, а то і болей дзяцей — столькі, колькі Божачка дасць!

Але ж той гэтых просьбаў не чуў — даў толькі адно — сына.

Гадавалі. І ўжо з надзеяй (ды што там — з разлікам...) на ўнукаў будавалі вялізны дом, «лішнюю» кватэру, адкладвалі нежартоўныя грошы, чакалі.

Але і гэта было дарэмна: нявестка ну ніяк не магла зацяжараць, а потым, калі цуды такі здараліся, — вынасіць тое малое.

І тады, каб з надзеямі разам не траціць, не губляць яшчэ і час, усе разам яны вырашылі, што трэба шукаць сурагатную маці.

Знайшлі, аплацілі ўсе паслугі, дачакаліся ўнучкі!..

Не паспелі пацешыцца — бацькі той маленькай падалі на развод. І з кім жа дзіця — пытанне. Прычым — невырашальнае! Бо маці (родная, з дазволу — біялагічная), «рукі звязваць сабе не хоча» ды і кажа, што не паспела яна палюбіць тое малое, бацька — таксама. Бабулі (адна з дыябетам, другой за семдзясят) пазіраюць адна на адну...

Дзядулі ж, ну таго, што з вялікай сям'і, што душы ў маленькай не чуў, што так хацеў, каб дзяцей было шмат і для гэтага ўсё забяспечыў, таго, што цяпер усіх бы паставіў на месцы ці проста паслаў, ужо... няма: з астмай, без лекаў вывеў з дому сабаку.

І назад — не вярнуўся.

## СПРАВА ДЛЯ САПРАЎДНЫХ МУЖЧЫН

Спачатку ў пад'ездзе, на дошцы для абвестак, з'явіўся «дакумент» — «График уборки помещений», потым — і сам той «уборшчык». Што трохі здзівіла — мужчына, гадоў шасцідзесяці, досыць прыемнай знешнасці (па якой, дарэчы, ну ніяк было не згадаць — хто ён, з якіх? З рабочых? Як быццам не? З вяскоўцаў ці вайскоўцаў? Ні ў якім разе! З інтэлігентаў? Таксама не сказаў бы. Загадка)...

Мужык між тым шторанак прыязна вітаў жыхароў і спакойна, без ніякіх комплексаў змятаў у шуфлік смецце, выціраў пыл з падваконняў, размахваў швабрай.

— Справу сабе знайшоў, — з пагардай хмыкалі асобныя з жыльцоў. — Пасаромеўся б... Мужчына...

Не так даўно мы сутыкнуліся — на парозе кнігарні. Ён не адзін выходзіў адтуль — відавочна, з унучкай. Тая (а ўжо ж шчаслівая! Гадкоў пяці...) прыцiскала да грудзей прыгажэзную кнігу «Лепшыя казкі народаў свету».

Спецыяльна потым паглядзела: кніжка гэтая — проста цуд! Але і каштуе сто з лішкам тысяч.

З пенсіі (вядома ж, не вайсковай) дзядуля такую наўрад ці купіў бы — трэба зарабляць.

А хоць бы і падмятаючы.

## ШЧАСЦЕ

...Некалі, паступіўшы ў адзін інстытут, яны аж скакалі ад радасці: «Якое шчасце! Якое шчасце!». Большага — ім здавалася — ужо не бывае!

Але ж яно было (яшчэ і колькі!), бо сяброўкі — адна і другая — сустрэлі нядрэнных хлопцаў, пайшлі за іх замуж, нарадзілі і вырасцілі дзяцей, пажанілі ўнукаў...

Цяпер ім абедзвюм ужо за восемдзесят — пастарэлі, на жаль, паўдавелі, нажылі па букеце хвароб. Але ж адна яшчэ неяк трымаецца. А вось другая... Пасля інсульту...

Насілу ўстае (сын да біла вяроўку прывязаў). Па сцэначцы ідзе ў прыбіральню. Але — *сама!*

І вось гэта, кажа, найбольшае шчасце!

## ЗДЗІЎ

Зубачысткі — маленькія, вострыя палачкі — гэта драбяза, гэта «ёсць і добра», гэта, ну вядома ж, размовы не варта! Але... было, пакуль...

Пакуль іх (у якасці сувеніра, у маленькім, адмысловым збаночку) не прывезлі з ваколіц Парыжа, не паставілі на кухонным стале. І тым самым «не паказалі», што гэтыя, новыя — куды танчэйшыя за «старыя» (але чамусьці не ломяцца)! І куды вастрэйшыя. Але чамусьці не тупяцца...

Яны з іншай пароды дрэва, па-іншаму зроблены.

І чаму не ў нас?

## КАТЛЕТЫ

Двое дзетак — ладных, разумных — у гэтай сямейцы ўжо расло. Трэцяга не дужа і хацелі, але Бог ім даў. Дзяўчынку.

Маці рада была, што не хлопчык. Бацька сказаў: «Хай будзе».

І малая тая была: не сказаць, што прыгожая (што разумная, дужа здольная ці старанная) — не сказаць, што не. Дзяўчо як дзяўчо. Хлопцы лепей вучыліся (асабліва — большы). Адпаведна, больш падавалі надзей — што недзе паступяць, на некага вывучацца, пазаймаюць пасады... Лёс жа малой бацькі спалі і бачылі так: ну стане бухгалтаркай ці паштаркай, ну выйдзе за якога шафёра (у лепшым выпадку), ну пабудуюць паблізу хату...

Людзі мяркуюць — размяркоўвае Бог: як ні дзіўна, тая малодшая таксама паступіла вучыцца, таксама атрымала дыплом, пабралася з такім жа адукаваным, стала рабіць кар'еру...

Але ж у вачах бацькоў аўтарытэту параней шаму... не мела. Можа, таму, што часта прыязджала (хлопцы не маглі, занятыя). І тады, закасаўшы рукавы (ну баба ж бабай) мыла, садзіла, палола, прыбірала, гатавала...

У тую нядзелю (апроч іншага) катлет нарабіла — цэлы рондаль бацькам пакінула.

І едакоў Бог даў: сыны паклапаціліся — два мужыкі з лясгаса дровы прывезлі, у хату прыйшлі. Гаспадар, як водзіцца, пляшку на стол паставіў, гаспадыня — закуску. І шмат жа чаго было! Ды госці (абодва гарадскія, сямейныя, у аднаго, казаў, жонка повар) катлет паспыталі і больш ні на што не глядзяць: з дазволу ўплятаюць за абедзве шчакі ды нахвальваюць: смачнейшага, маўляў, анічога не елі! З чаго? І хто ж гатаваў?

— Дачка, — казалі старыя...

І ці не першы раз менавіта ёй ганарыліся.

## ТОЙ ДЗЕНЬ

Стары, зжаўцелы ад часу нататнік. Апошні ліст. Загаловак (і, між іншым, крадзены) — «Адзін дзень з жыцця жанчыны». Жменя рассыпаных слоў:

...Калі я — нарэшце — спаткала Вас,
Лепшага дня — не было!
Дзівачка, хацела аддаць
Усю цеплыню свайго сэрца...
Але вам без яе было цёпла.
Хацела тады падтрымаць
У якую хвіліну.
Але Вы й без мяне
Трымаліся годна.
Думала хоць пакарміць...
Вы не хацелі есці!
...Вось так, паступова,
Найлепшы дзень у жыцці
Зрабіўся найгоршым.

...Чалавека, якому — «нарэшце спаткаўшы» — анічым не прыдалася, ну вядома ж, памятаю! А вось дзень...

Праўду кажуць: калі хочаш нешта запомніць — запішы.

## ВЯРТАННЕ

...Пішу, а то забудуся.

Горад. Дзень — пасажыраў у аўтобусе мала, можа, з дзясятак. Зрэшты, гэту маладзіцу вылучыў бы са ста. Бо яна — да бабкі не хадзі, на твары напісана: піла, піла доўга і, мусіць, па-чорнаму. Але ж здарыўся нейкі цуд: спынілася, бач, «завязала», вяртаецца да жыцця! Цяпер во — просценька, але чыста апранулася, акуратна прычасалася, села, некуды едзе. І пры гэтым, як дзіця, здзіўлена разглядае — то заліты сонцам праспект, што гудзе за вокнамі, то людзей, што стаяць паблізу, і ўжо не круцяць насамі, не грэбуюць ёй.

Дык яна ж за гэта (на твары напісана) — з удзячнасці... З любасці... Што заўгодна!

А найпершае і тут — пасунуцца, сказаць (ды хоць каму):

— Сядайце!

...І кароткае «Дзякуй», і «Не хачу», яна, відаць, зразумела б, бо ў аўтобусе месцаў вольных хапала.

Але слоў... не было. Мужчына (яе гадоў... А ўжо ж інтэлігентны, прыгожы-прыгожы) проста... сеў. Поруч!

Твар жанчыны (ссінелы...) заліўся прыгожай чырванню, на вачах праступілі слёзы — слёзы радасці, слёзы гонару — за сябе. За людзей... Ёй пакуль невядомых.

**Валянціна ДОЎНАР**

# МАГІЛЁЎСКАЯ ДЫЕТА — МЯСА З МАЛАКОМ

## У Магілёве ў суботу і нядзелю пройдзе кірмаш мясных і малочных вырабаў

**У выхадныя дні на пляцоўцы каля Палаца культуры вобласці сваю прадукцыю прадставяць больш за 40 вытворцаў. Гэта будуць не толькі перапрацоўчыя прадпрыемствы, але і сельскія гаспадаркі, прыватныя фірмы. Пакупнікам прапануюць шырокі асартымент і прымальныя цэны.**

Традыцыйна на кірмашах можна будзе пачаставацца блінамі, дранікамі і шашлыком, рознымі напоямі. Падобныя кірмашы, дзе можна набыць розныя тавары, праводзяцца ў Магілёве нярэдка: з аднаго боку, вытворцы павялічваюць рэалізацыю сваёй прадукцыі, з другога, людзі набываюць яе па выгадных для іх (больш танных, чым звычайна ў гандлі) цэнах.

**Алена КАЗЛОВА.**

# ЭХ, ВЫ, КОНІ, ЦЯПЕР «ПРАВІЛЬНЫЯ» КОНІ

**Пастановай Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання ў краіне ўпершыню зацверджаны ветэрынарна-санітарныя правілы па гадоўлі пушных звяроў у клетках, а таксама па гадоўлі і развядзенні коней. Згаданыя правілы распрацаваны ў мэтах фарміравання нарматыўнай базы.**

— Ветэрынарна-санітарныя правілы гадоўлі пушных звяроў у клетках вызначаюць абавязковыя для захавання патрабаванні да правядзення ветэрынарных мерапрыемстваў, умоў развядзення і гадоўлі пушных звяроў, іх забою, вытворчасці і захаванню шкурак. Напрыклад, у іх прапісаны патрабаванні да размяшчэння зверагаспадаркі і яе аб'ектаў, асобна — да ўтрымання норак, лісіц і пясцоў, кармоў для іх, — расказаў намеснік начальніка дзяржаўнай ветэрынарнай інспекцыі дэпартамента ветэрынарнага і харчовага нагляду Мінсельгасхарча Віталь Масарноўскі. — Патрабаванні абавязковыя для захавання юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія займаюцца развядзеннем пушных звяроў, незалежна ад формаў уласнасці і ведамаснай падпарадкаванасці.

Ветэрынарна-санітарныя правілы вырошчвання і развядзення коней вызначаюць патрабаванні да ўтрымання (скажам, да плошчаў стойлаў, секцый, канструкцый і вышыні агароджаў, кармушак і г.д.) і кармлення, эксплуатацыі коней, ахове комплексаў (фермаў) ад заносу інфекцыйных і інвазійных хваробаў. Правілы абавязковыя да выканання юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, якія займаюцца гадоўляй і развядзеннем коней.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**по продаже предприятия как имущественного комплекса**
**(ЧУП «Бобруйский комбинат нетканых материалов» Белкоопсоюза)**

**Организатор аукциона:** Частное унитарное предприятие «Научно-производственный центр Белкоопсоюза» (далее по тексту — ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза»), г. Минск, пр-т Победителей, 17, 1001. Тел. (029) 318 37 22, (017) 226 91 19, (017) 226 99 22.

Аукцион проводится **16 июля 2012 г.** в 15 часов 00 минут по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 17 в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества организаций потребительской кооперации, собственником которого является Белкоопсоюз.

**Сведения о предмете аукциона:** предприятие как имущественный комплекс, с регистрационным номером 0001109, созданное на базе Частного производственного предприятия «Бобруйский комбинат нетканых материалов» Белкоопсоюза, расположенное по адресу: 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Тимирязева, 5, путем продажи на аукционе с начальной ценой продажи без учета НДС: 11 200 000 000 (одиннадцать миллиардов двести миллионов) руб.

Предприятие расположено на земельных участках общей площадью 7,0259 га, расположенных по адресам: 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Тимирязева, 5, пер. Тимирязева, 4 и ул. Бахарова, 269, предоставленные на праве постоянного пользования решениями Бобруйского городского исполнительного комитета от 27.05.1993 № 4802 и от 23.09.2008 № 19-8.

Условие продажи: с условием реализации бизнес-плана инвестиционного проекта «Реконструкция и техническое переоснащение производства нетканых материалов на ЧУП «Бобруйский комбинат нетканых материалов» Белкоопсоюза».

Объект торгов обременен договорами аренды.

Срок и условия оплаты: определяются по согласованию победителя торгов с собственником имущества при заключении договора купли-продажи.

**Задаток:** 1 120 000 000 (один миллиард сто двадцать миллионов) руб.

Задаток перечисляется ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза», р/с 3015201080017, УНН 100060419, ОКПО 14586268, ф-л МГД ОАО «Белагропромбанк» г. Минска, код 963.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 17, каб. 1004а, 1001, с 8.30 до 12.30 и с 13.30 до 17.30 в рабочие дни. Прием документов заканчивается в 15 часов 00 минут 13 июля 2012 г.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в Извещении;

индивидуальными предпринимателями — резидентами Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии;

юридическими лицами — резидентами Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, копия устава (учредительного договора — для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии;

индивидуальными предпринимателями — нерезидентами Республики Беларусь — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

юридическими лицами — нерезидентами Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица — также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

**Сведения о продавце:** Белкоопсоюз, 220004 г. Минск, пр-т Победителей, 17.

За справками обращаться на ЧУП «Бобруйский комбинат нетканых материалов» Белкоопсоюза, 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Тимирязева, 5, тел. (0225) 48 50 51.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты, связанные с организацией и проведением аукциона. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных платежей продавец заключает с ним договор купли-продажи предмета аукциона в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**ПОСТАВСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
(211875, Витебская обл., г. Поставы, пл. Ленина, 25)

## 17 июля 2012 года в 10.00 ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже в частную собственность земельного участка с кадастровым номером 224050100001004391 площадью 0,1007 га для строительства и обслуживания жилого дома в г. Поставы, пер. Кирова, д. 32.**

Аукцион проводится в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25) в кабинете заместителя председателя райисполкома по экономике (III этаж, каб. 58).

Начальная цена предмета аукциона **52 447 380** (пятьдесят два миллиона четыреста сорок семь тысяч триста восемьдесят) белорусских рублей.

Победитель аукциона обязан в 10-дневный срок со дня принятия райисполкомом решения о предоставлении земельного участка в частную собственность:

- возместить организатору аукциона (Поставскому райисполкому) расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка в сумме **3 384 857** белорусских рублей.
- приступить к занятию земельного участка по целевому назначению в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство жилого дома.

По вопросам получения дополнительной информации о земельном участке, ознакомления с земельно-кадастровой документацией, подачи заявления на участие в аукционе обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома по адресу: г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. № 11, контактные телефоны 8 (02155) 43180, 41132.

**Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 со дня публикации настоящего объявления до 10 июля 2012 года включительно.**

Право участия в аукционе имеют граждане Республики Беларусь не зависимо от места жительства и нуждаемости в улучшении жилищных условий.

Для участия в аукционе заинтересованные лица или их уполномоченные представители в установленный в извещении срок подают в комиссию заявления об участии в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, а также предъявляют квитанцию об оплате задатка на внебюджетный счет (назначение платежа – задаток за участие в аукционе, сумма задатка – 10% от начальной цены лота, указанной в настоящем извещении.)

Кроме того, в комиссию представляются:

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопии стр. 25, 31, 32 личного паспорта);
- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

**Размер задатка – 5 244 740 белорусских рублей.**

**Реквизиты получателя платежа для перечисления денежных средств (задатка за участие в аукционе) – Поставский райисполком, счет № 3641324000009 в ЦБУ № 230 филиала № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Полоцке, код банка 150801648.**

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**О проведении 27 июля 2012 г. аукциона по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Страдечском сельском Совете Брестского района**

| № лота | Местоположение земельного участка | Площадь, га | Начальная (стартовая) стоимость земельного участка, руб. | Целевое назначение земельного участка и его кадастровый № |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **Брестская обл., Брестский район, д. Прилуки, ул. Береговая, 2.** | 0,1504 | 11 911 680 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; № 121280403101000356 |
| | Сумма задатка, руб. | | 1 200 000 | |
| | Расходы: - на изготовление земельно-кадастровой документации; | | 1 939 592 | |
| | - на регистрацию создания земельного участка, руб.; | | 300 000 | |
| | - на размещение объявлений в средства массовой информации | | Согласно акту выполненных работ | |
| 2. | **Брестская обл., Брестский район, д. Прилуки, ул. Березовая, 1.** | 0,1501 | 11 887 920 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; № 121280403101000357 |
| | Сумма задатка, руб. | | 1 200 000 | |
| | Расходы: - на изготовление земельно-кадастровой документации; | | 1 939 592 | |
| | - на регистрацию создания земельного участка, руб.; | | 300 000 | |
| | - на размещение объявлений в средства массовой информации | | Согласно акту выполненных работ | |

Аукцион будет проводиться **27.07.2012 г. в 10.00** по адресу: Брестский район, д. Страдечь, ул. Александрова, 60 (здание сельисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Страдечского сельисполкома № 3641010400107 в ЦБУ № 104 филиал № 126 ОАО «АСБ Беларусбанк» код 252, УНП 200035850, задаток; документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Брестский район, д. Страдечь, ул. Александрова, 60 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений – **до 17.00 23 июля 2012 г.**

**Контактные телефоны: 91 42 39, 91 41 11, 91 44 66.**

---

УНП 600068480

**Уважаемые акционеры ОАО «Рапс»**
**27 июня 2012 года СОСТОИТСЯ**
**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «Рапс»,

**расположенного по адресу:**
**Минская обл., Минский район, 223014, аг. Крупица.**

**Собрание пройдет по адресу:**
**Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, административное здание ОАО «Рапс», первый этаж, актовый зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**
1. О совершении крупной сделки с ОАО «Белагропромбанк».

*С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, ОАО «Рапс» (бухгалтерия) с 19 по 26 июня 2012 года (время работы с 14.00 до 16.00) либо 27 июня 2012 г. по месту проведения собрания.*

Регистрация участников собрания с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания — 27 июня 2012 г. в 11.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 20 июня 2012 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке!**

*Справки по тел.: 8 (017) 506 94 14, 8 017 506 93 41.*

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ЧУП «Поречье Белкоопсоюза» (продавец) ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЙ (третий) ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже одним лотом недвижимого имущества, расположенного по адресу: Минская область, Минский район, район агрогородка Острошицкий Городок,**
в составе: спальный корпус (инв. № 600/С-57829), об. пл. **3113 кв.м;** лечебно-профилактический блок со столовой (инв. № 600/С-57830), об. пл. **2409,6 кв.м;** гараж (инв. № 600/С-125975), об. пл. **124,4 кв.м.**

**Начальная цена с НДС (снижена на 36%) – 5 724 997 110 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **0,9494 га**
(предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10 (десяти) дней** после проведения аукциона. **Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.**

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенным на сайте организатора аукциона www.rlt.by.**

*Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 20.03.2012.*

Аукцион состоится **20.07.2012** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.07.2012** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

---

**Паритетбанк**
**www.paritetbank.by**

**«Открытое акционерное общество «Паритетбанк», расположенное по адресу: 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а, СООБЩАЕТ, что 27 июня 2012 года**
***в соответствии с решением Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк»***
**ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. О процедурных вопросах.
2. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
3. О Независимом директоре ОАО «Паритетбанк».
4. Об утверждении Изменений и дополнений № 3 в Положение о Наблюдательном Совете ОАО «Паритетбанк» от 26.08.2004 № 01-04-05/1980, утвержденное протоколом Общего собрания акционеров от 18.08.2004 № 4 (в редакции Протоколов Общего собрания акционеров от 27.04.2007 № 4, от 26.03.2009 № 1, от 30.06.2010 № 4).

Собрание проводится по адресу: г. Минск, ул. Киселёва, 61а, комн. 205.

Список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 18 июня 2012 года.

Бюллетени для заочного голосования и другие материалы к собранию участники собрания могут получить по указанному адресу 19 и 20 июня 2012 года с 9.00 до 13.00 по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть возвращены не позднее 22 июня 2012 года по месту проведения Общего собрания акционеров, дата подсчета голосов – 26 июня 2012 года.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Паритетбанк» в указанном порядке, которые включаются в одноименный список.

Телефон для справок: 288 64 74.

**Наблюдательный Совет ОАО «Паритетбанк».**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 5 от 27.10.2006 г. УНП 100233809.*

---

***Уважаемые акционеры ОАО «МАПИД»***

**25 июня 2012 года СОСТОИТСЯ**
**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «МАПИД»,

**расположенного по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205.**
**Собрание созывается по инициативе Наблюдательного совета ОАО «МАПИД».**
**Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, зал заседаний.**
**Начало работы собрания – 25 июня 2012 года, 15.00**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
1. Увеличение уставного фонда ОАО «МАПИД» на сумму оказанной государственной поддержки. Дополнительная эмиссия акций.
2. Приведение уставного фонда ОАО «МАПИД» в соответствие с чистыми активами. Увеличение номинальной стоимости акции.
3. Внесение соответствующих изменений в Устав Общества.
4. О создании холдинга на базе ГПО «Минскстрой» с участием ОАО «МАПИД».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205А, к. 2 с 18 июня 2012 по 24 июня 2012 года либо 25 июня 2012 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 13.30 до 14.30 по месту проведения собрания.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на 18 июня 2012 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
• акционеру общества – паспорт;
• представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100008115

**Администрация**

---

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 29 июня 2012 г. 125-го ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Минский городской центр недвижимости

## по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска

| № предмета аукциона | Наименование объекта недвижимости, его адрес, описание, условия аукциона | Арендуемая площадь, кв.м | Цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|
| | **КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска», тел. 285-56-02** | | |
| **1.** | Ул. Красина, 7, часть капитального строения на первом и втором этажах отдельно стоящего административного здания, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, водоснабжение, отдельный вход. Требуется ремонт. Под административное использование – офис. | 540,7 | 27 100 |
| **2.** | Ул. Жилуновича, 43, площади на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, общий вход с другими арендаторами, санузел совместного пользования. Под торговый объект продовольственной, непродовольственной группы товаров. | 25,9 | 2 600 |
| **3.** | Пр. Партизанский, 87, помещение на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел, отдельный вход. Под кафе, бар. | 106,1 | 10 650 |
| **4.** | Ул. Голодеда, 59, площади на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, общий вход с другими арендаторами, санузел совместного пользования. Под административное использование – офис, склад. | 11,0 | 1 100 |
| | **КУП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска», тел. 223-35-03** | | |
| **5.** | Ул. Плеханова, 72, помещение на втором этаже в здании коммунально-бытового обслуживания, имеется естественное освещение, отопление, водоснабжение. Под административное использование – офис. | 482,1 | 48 300 |
| **6.** | Ул. Плеханова, 72, помещение на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, водоснабжение, санузел, требуется ремонт. Под административное использование – офис. | 90,6 | 9 100 |
| | **КУП «ЖРЭО Московского района г. Минска», тел. 252-80-63** | | |
| **7.** | Ул. Короля, 4, помещение на первом этаже жилого дома, имеется естественное освещение, отопление, арендатору необходимо установить индивидуальный электросчетчик. Под административное использование – офис. | 12,5 | 1 250 |
